# ПРАВІЛЫ ДЛЯ АЎТАРАЎ

Тэкст артыкула падаецца ў рэдакцыю часопіса на электронным носьбіце і ў друкаваным экзэмпляры ў адпаведнасці з наступнымі тэхнічнымі патрабаваннямі:

- аб'ём артыкула – да 40 тыс. знакаў з прабеламі (1 друкаваны аркуш), у гэты аб'ём уваходзяць тэкст, тры рэзюмэ, табліцы, фотаздымкі, малюнкі і спіс літаратуры;
- тэкст артыкула і рэзюмэ павінны знаходзіцца ў адным файле;
- у артыкуле ўказваюцца: імя, прозвішча, вучоная ступень і званне аўтара (аўтараў), арганізацыя, якую ён (яны) прадстаўляе, пасада, якую ён (яны) займае, горад, краіна, адрас электроннай пошты (e-mail);
- назва артыкула павінна быць набрана малымі літарамі (за выключэннем абрэвіятур);
- назва файла, які ўтрымлівае тэкст артыкула, павінна супадаць з першымі 8 літарамі прозвішча аўтара лацінскімі літарамі;
- табліцы і малюнкі павінны быць пранумараваны і мець назвы, а ў тэксце артыкула павінны быць адзначаны спасылкамі (мал. 1) ці (табл. 1);
- фотаздымкі і малюнкі, якія змяшчаюцца ў артыкуле, дадаткова павінны знаходзіцца ў асобным графічным файле фармата TIFF ці JPEG (пашырэнне не менш за 300 dpi);
- для падачы ў рэдакцыю тэкст друкуецца праз 1,5 інтэрвала, шрыфт Times New Roman, памер 12 пунктаў.

Указанне індэксу УДК з'яўляецца неабходнай умовай.

Структура і змест артыкула:

- **ключавыя словы** і **рэферат** на трох мовах (рускай, беларускай, англійскай);
- **уводзіны**, у якіх фармулюецца актуальнасць даследавання і апісваецца аб'ект даследавання;
- **агляд замежнай і айчыннай літаратуры**, які пацвярджае адсутнасць у літаратурных крыніцах вырашэння пастаўленай у артыкуле задачы, і які паказвае папярэднікаў, на даследаваннях якіх грунтуецца праца;
- **вызначэнне мэты і пастаноўка задач**;
- **апісанне даследавання** (асноўная частка артыкула);
- **заключэнне**, у якім коратка падводзяцца вынікі навуковага даследавання. Высновы павінны лагічна адпавядаць пастаўленым у пачатку артыкула задачам;
- **спіс літаратуры**.

У рэфераты на рускай мове, калі артыкул на беларускай мове (альбо на беларускай мове, калі артыкул на рускай мове) акрамя тэксту ўваходзяць пераклад назвы малымі літарамі (за выключэннем абрэвіятур), прозвішча і імя аўтара (аўтараў) у адпаведнасці з пашпартам, арганізацыя, якую ён (яны) прадстаўляе. Рефераты павінны адлюстроўваць асноўныя вынікі і высновы даследавання. Памер кожнага рэферата **300 – 500 знакаў**.

Літаратура і крыніцы, выкарыстаныя ў артыкуле, размяшчаюцца пасля тэксту артыкула спісам у алфавітным парадку або ў парадку з'яўлення спасылак у тэксце. Спасылкі абазначаюцца парадкавым нумарам у квадратных дужках па схеме: [1, с. 25 – 31].

Спіс літаратуры і крыніц афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь.

Да артыкула павінны быць прыкладзены:

- рэкамендацыя аддзела ці кафедры,
- дзве рэцэнзіі спецыялістаў у пэўнай галіне (доктара альбо кандыдата навук).

Аўтар артыкула нясе адказнасць за накіраванне ў рэдакцыю матэрыялаў, якія былі раней апублікаваны ў друку, альбо якія прыняты да друку іншымі выданнямі.

Рэдакцыйная калегія не спаганяе з аўтараў плату за друкаванне артыкулаў і іншых матэрыялаў. Аўтар дае на бязвыплатнай аснове рэдакцыі права на выданне і наступнае распаўсюджванне артыкула ў друкаваным выглядзе і на размяшчэнне электронных копій артыкула ў базах даных, прадстаўленых у выглядзе навуковых інфармацыйных рэсурсаў сеткі Інтэрнэт, акрамя таго права на атрыманне метададзеных (перапрацоўку) артыкула і выкарыстанне іх для напаўнення баз дадзеных. Артыкул прымаецца да апублікавання пасля разгляду рэдакцыйнай калегіяй. Пры гэтым адхіленыя рэдкалегіяй рукапісы не вяртаюцца і не рэдагуюцца.

Пры невыкананні ўказаных патрабаванняў матэрыялы да публікацыі могуць не прымацца.

**УВАГА!**

Рэдакцыйная калегія дае магчымасць першачарговага друкавання артыкулаў асобам, якія з'яўляюцца аспірантамі, дактарантамі і суіскальнікамі навуковай ступені ў год завяршэння навучання, што павінна быць адлюстравана ў рэцэнзіі.